*Любоў Сівурава*

# КОНЬ У СЯМЕЙНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Важныя міфарытуальныя функцыі ў абрадах і рытуалах жыццёвага цыкла належылі свойскай жывёле. Абраднасць суправаджала беларусаў на працягу ўсяго жыцця — ад нараджэння і да смерці. Актам сацыялізацыі дзіцяці было далучэнне яго да ўлоння царквы, хрышчэнне. Лепшай транспартнай жывёлай для таго, каб адвезці дзіця ў храм, лічыўся вол, ад якога, паводле прынцыпу “падобнае выклікае падобнае”, нованароджанаму павінны былі перадацца дабрыня, працавітасць, няспешнасць і іншыя станоўчыя рысы характару [3, с. 127; 7, с. 152]. Конь шанаваўся за здольнасць хутка перамяшчацца. Па меркаванні беларускіх сялян, хуткая язда ахоўвала ад нячыстых сіл, якія маглі пашкодзіць нованароджанаму.

Калі кумы збіраліся да касцёла, бацька выліваў пад пярэднія ногі запрэжанаму каню поўнае вядро вады [3, с. 127; **Ошибка! Неизвестный аргумент ключа.**, с. 303]. Паводзіны жывёл на шляху да храма вызначалі рысы характару дзіцяці. Упартасць, непаслухмянасць і іншыя неадпаведныя нормам паводзіны коней альбо такія несанкцыянаваныя выпадкі, як незапланаваны прыпынак фурманкі, страта кола, распраганне коней, маглі адмоўна адбіцца на лёсе нованароджанага [3, с. 129]. *“Калі ў дарозе, як вязуць хрысціць дзіця, да распрагуцца коні, то дзіця будзе вельмі ўпрамае і непаслушнае; калі выпадзе загвоздка да спадзе кола, то дзіця, як вырасце, будзе ўсё губіць, раскідаць і ніколі ў яго не будзе парадку”* [7, с. 153; 3, с. 129].Калі аналагічныя здарэнні адбываліся па дарозе да вянца, то гэта неспрыяльна адбівалася на лёсе будучай сям’і [3, с. 129].

Паваротным пунктам на жыццёвым шляху чалавека з’яўляецца вяселле. Яно азначае змену сацыяльнага статуса маладых, якія бяруць шлюб. Вясельнаму абраду ўласцівая строгая рэгламентацыя. Выкананне належных абрадаў, рытуалаў, трыманне перасцярог лічылася ўмовай шчаслівага жыцця сямейнай пары.

Існавала своеасаблівая сістэма правіл і табу ў дачыненні да жывёл — удзельнікаў шлюбнага абраду. Коней, якія мелі сутыкненне з нежывой матэрыяй, забаранялася выкарыстоўваць для шлюбных мэтаў: *“Маладых пад вянец няможна везці на том кані, на яком ужэ везлі нябожчыка, бо маладыя хутка памруць”*[7, с. 151]. Да выканання рытуальнай ролі не дапускаліся коні, якія паводзілі сябе не належным чынам: *“Калі перад шлюбам сват прыязджае да маладой, а конь пачне перад варотамі храпці і адступаць назад, сват вяртаецца дадомуі бярэ іншага каня”* [3, с. 204–205].*“Калі вясельныя коні, пакуль ідзе вянчанне, стаяць спакойна, жыццё у маладых будзе ціхае і аднастайнае; жвавасць і парывістыя рухі коней прадказваюць вясёлае жыццё”* [3, с. 219].

Падзеі і здарэнні, якія адбываліся з конямі ў дарозе, маглі паўплываць на лёс будучых мужа і жонкі. Імкнучыся пазбегнуць непрыемных здарэнняў у дарозе, перад тым, як рушыць з месца, аглядалі воз і збрую, таму што *“калі нешта здарыцца ў дарозе, маладыя будуць жыць разам нядоўга і нешчасліва”; “калі па дарозе распражэцца конь, адваліцца кола, зламаецца вось ці аглобля і наогул адбудзецца нейкая замінка, то жыццё ў маладых не будзе шчаслівае; у самым лёгкім выпадку ў іх будуць паміраць дзеці”* [3, с. 210–211].

У якасці моцнага ачышчальнага і прадуктыўнага сродка ў вясельным абрадзе выкарыстоўваўся агонь.Праз яго пераводзілі каня, на якім ехалі маладыя пасля вянца.*“Каб маладая была гостра, не далася ў мужыковай хаце па сваём карку паехаць, то, перш чым коні рушаць, запальваюць перад першым возам вязанку жытняй саломы і адначасова з успыхваннем полымя кучар сцябае коней і вымушае іх пераскочыць цераз агонь. Іншыя для таго так робяць, каб уся сварка за імі засталася, каб на быт прыехалі чыстыя і спакойныя”* [3, с. 220]. *“Калі пасля вяселля вязуць маладога з маладой, то перад дваром раскладваюць агонь і “дружко” з дапамогаю іншых “баяроў” цягне коней і воз з маладымі абавязкова праз агонь — каб ім Бог паслаў жыццё ў дастатку”* [3, с. 220].

Пол жывёл у шлюбнымпоездзе мог абумовіць пол дзяцей, якія маюць нарадзіцца. Таму належала запрагаць у калёсы рознаполых жывёл: *“Да гэтага воза, што маладыя едуць да шлюбу, канечне, трэба запрагчы каня з кабылаю, бо каб абодва коні або кабылы былі, то маладая або самыя сыны, або дочкі вадзіла б”* [3, с. 210].

Каня, на якім ехалі маладыя да вянца, накрывалі ручніком. Ручнік падкрэсліваў рытуальную значнасць жывёлаў — удзельнікаў шлюбнага поезда[8, с. 73]. Перад ад’ездам маладых да вянца бацькі здзяйснялі рытуальны абыход вясельнай працэсіі з хлебам-соллю, акраплялі коней вадою, абсыпалі жытам.

Пры аналізе чарадзейнай казкі У.Я. Проп пісаў, што казка (як і іншыя жанры фальклору — Л.С.) вырастае з сацыяльнага жыцця і яго інстытутаў [5, с. 243]. Казка, абрадавая песня акцэнтуюць увагу менавітана тым адрэзку жыцця героя-мужчыны, калі ён дасягае дарослага стану, знаходзіцца на шляху самавызначэння. Перад уступленнем у шлюб герой праходзіць шэраг выпрабаванняў на сілу, мужнасць. Менавіта шлюбам завяршаўсяперыяд сталення героя.

У архаічных культурах пераход з юнацкага стану ў дарослы, дасягненне хлопцам полавасталасці адпаведным чынам арганізоўваўся сацыяльным асяроддзем. Цырымонія пасвячэння юнакоў складалась з шэрагу маніпуляцый і выпрабаванняў, якія насілі пакутніцкі характар [1, с. 115-116]. Юнакі павінны былі з гонарам вытрымаць гэтыя выпрабаванні і тым сцвердзіць сваю мужнасць і сталасць. Юнакі, якія праходзілі абрад ініцыяцыі, атрымлівалі правы дарослых — права ўступаць у шлюб, насіць ваярскістрой.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

Пасад маладогапрааналізаваў М.М. Нікольскі. Абрад узнаўляецца ім паводле апісання М.В. Доўнар-Запольскага [2, с. 121]. Адзін з мужчын, член роду, абшчыны, грамады, якога называюць “братам”, тройчы абводзіць жаніха вакол “дзяжы” і саджае яго на вывернуты кажух, якім была накрыта дзяжа. Сябры жаніха расчэсваюць яму валасы і пастрыгаюць іх. Цырымонія заканчваецца падпальваннем валасоў маладога на ілбе, патыліцы і каля вушэй, якое пачынае “брат” і працягваюць усе хлопцы. Валасы падпальваюць грамнічнай свечкай альбо агнём, здабытым ад “белага каменя” — крэмня. Абрад суправаджаецца песняй: *“Пастрыгайся, Янечка, з рабяцкага стану да ў мужчынскую славу”*. Аўтар лічыць выкарыстанне дзяжы і авечай скуры пазнейшым напластаваннем. Ён адносіць паходжанне гэтага абраду ў даземляробчую эпоху і звязвае з татэмістычнымі культамі, у прыватнасці, з культам мядзведзя: “Старажытны пасад жаніха на мядзвежую шкуру надзяляе яго ўласцівасцямі мядзведзя, неабходнымі дарасламу, фізічна моцнаму мужчыне, мужчыне і воіну” [5, с. 113–114, 133].

Думку аб тым, што чарадзейная казка сваімі каранямі паходзіць з рытуалаў ініцыяцыі, развівае М. Эліадэ: “...тут сустракаюцца выпрабаванні, характэрныя для рытуалаў ініцыяцыі (змаганне з пачварамі, непераадольныя на першы погляд перашкоды, загадкі, якія прапануюцца герою, заданні, якія немагчыма выканаць, і г.д.), сыходжанне ў пекла альбо ўзнясенне на неба, смерць альбо ўваскрэсенне (што, зрэшты, адно і тое ж), жаніцьба на царскай дачцэ. Змест казкі заключаецца ў пераходзе праз сімвалічную смерць і адраджэнне ад няведання і няспеласці да духоўнай сталасці” [8, с. 208–209]. На наш погляд, абрад пасаду маладога, зафіксаваны М.В. Доўнар-Запольскім, мог з’яўляцца адным з элементаў абраду ініцыяцыі, які належала прайсці юнаку на этапе сацыяльнага сталення.

Адным з паказчыкаў межавага стану маладога чалавека становіцца надзяленне яго канём (уяўнае альбо сімвалічнае). У вясельных песнях пяецца: *“Маці сыночка радзіла // З калена на каня садзіла”*, *“З прыпола на каня ўссадзіла”* [11, с. 223, 394], *“Маці сына да выраджала — // С колена да на коня саджала”* [2, с. 105]. Гэта азначала, што ў момант стварэння сям’і малады чалавек канчаткова пераходзіў з дзіцячага стану ў дарослы.Атрыманне юнаком каня азначае праходжанне ім пэўнага этапу сацыялізацыі. Конь з’яўляецца паказчыкам дастатковай ступені сталасці, разглядаецца ў якасці сродка для здзяйснення значных у сацыяльным плане ўчынкаў. Канём маркіруецца факт прызнання за маладым чалавекам права быць поўнавартасным членам грамады, здольным да стварэння сям’і і ўласнай гаспадаркі. Мужчына на кані — ваяр.Атрыманне каня вызначае яго гатоўнасць да выканання ваярскіх абавязкаў.

Асаблівае міфарытуальнае значэнне мелі коні ў пахавальным абрадзе. Для транспарціроўкі нябожчыка да месца пахавання выкарыстоўваліся, як правіла, старыя, непрыдатныя да прадаўжэння роду коні. У беларусаў існавала перакананне, што сутыкненне са смерцю накладае адбітак на іх дзетародныя якасці: *“Няможна везці мерцвяка на каровах або на кабыле, бо з тых часоў у кароў не будзе цялят, а ў кабылы жарабят”*. *“Пад нябожчыка запрагаюць каня самага худога і ніколі не запрагаюць жарэбую кабылку; пад мужчыну запрагаюць старога каня, а пад жанчыну — старую бясплодную кабылу. Жарэбую кабылу не запрагаюць пад нябожчыкаў, каб заўчасна не скінула плода”* [3, с. 277].

Лічылася, што датыкненне да нежывога накладае на жывёлаў адбітак, які затым можа адмоўным чынам паўплываць на маладых альбо нованароджаных — істот, якія знаходзяцца ў лімінальным (пераходным) стане, калі яны найбольш безабаронныя перад адмоўнымі сіламі. Каня пасля пахавальнага абраду нельга было выкарыстоўваць у вясельным поездзе.На ім таксама забаранялася везці дзіця ў царквудля хрышчэння. Беларускі этнограф Н.Я. Нікіфароўскі фіксаваў, “што конь, які быў пад нябожчыкам, потым выконвае найбольш цяжкія работы на раллі, на перавозцы хлеба, лесу, у возніцтве” [4, с. 144].

Атрыбутамі пахавальнага абраду былі ручнік, пояс, намітка. На ручніку альбо поясе вялі каня, на якім везлі дамавіну (повад спецыяльна на гэту пару адвязвалі). На Быхаўшчыне каня трымалі за “павадок” — ручнік у локаць даўжынёй. На Любаншчыне ад двара да пахавальнага воза слалі намітку [8, с. 84]. Пояс і намітка сімвалізавалі сабой дарогу для душы памерлага, *“белую дарогу ў вы-Рай”*. Пазней ад гэтых рэчаў пазбаўляліся, аддавалі жабракам альбо адносілі ў царкву.

Пералічаныя факты падкрэсліваюць важнае міфарытуальнае значэнне каня ў традыцыйнай культуры беларусаў. Жывёлы, якія выкарыстоўваюцца ў абрадах жыццёвага цыкла,разглядаюцца як прадказальнікі лёсу. Паводзіны коней падчас рытуальных дзеяў мелі асобы сакральны сэнс. Калі жывёлы весяляцца ў час вянчання — прадбачаць добрае шчаслівае жыццё; конь, на якім прывезлі да хворага святара, стаіць спакойна — гэта добры знак, стаіць бадзёра, падняўшы галаву, — хворы паправіцца, калі ж стаіць з апушчанай галавой, матляе ёю і б’е капытамі зямлю — чалавек памрэ [3, с. 281]. Акрамя статуснай і транспартнай, конь выконвае ў сямейных абрадах апатрапейную функцыю. У вясельным абрадзе конь здольны абясшкодзіць, абараніць маладога чалавека ад магчымага шкоднаснага ўздзеяння і стаць гарантам яго шчаслівага шлюбу.Такое стаўленне выяўляе антрапамарфізм, анімізм і іншыя міфалагічныя ўласцівасці традыцыйнага светапогляду.

**Спіс літаратуры:**


1. Балушок, В.Г. Инициации древних славян /В.Г. Балушок // Этнографическое обозрение. — 1993. — № 4. — С. 49-67.
2. Довнар-Запольский, М.В. Белорусская свадьба и свадебные песни. Этнографический этюд М. Запольского. — Киев, 1888. — 38 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Жыцця адвечны лад:беларускія народныя прыкметы і павер'і. / Уклад., прадм., пераклад,бібл. У. Васілевіча.Кн. 2. — Мінск: Беларусь, 2010. — 614 с.
4. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. — СПб., 1895. – 552 с.
5. Никольский, Н.М. Происхождение иистория белорусской свадебной обрядности. — Мінск: Изд-во АН БССР, 1956. — 273 с.
6. Пропп, В.Я. Исторические корни волшебной сказки / [Вступ. ст. В.И. Ереминой]; ЛГУ. — [2-е изд.] / В.Я. Пропп. — Л., 1986. — 334 с.
7. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў–палешукоў / Прадм. У.К. Каско ; Маст. В.Р. Мішчанка / А.К. Сержпутоўскі. — Мінск : Універсітэцкае, 1998. — 301 с.
8. Фадзеева, В. Беларускі ручнік. — Мінск: Полымя, 1994. — 326 с.
9. Элиаде, Мирча. Аспекты мифа. — М.: Академический Проект, 2001. — 240 с.
10. Federowski, M. Lud bialoruski na Rusi Litevskiej. T. 1. — Krakow : Wydawnictwo Komysji Antropologicznej Akademii Umiejetnosci, 1897. — 509 s.
11. Вяселле. Песні ў шасці кнігах. Кн. 1 / [Склад. Л.А. Малаш; Муз. дадат. З.Я Мажэйка; Рэд. М.Я. Грынблат; А.С. Фядосік]. — Мінск : Навука і тэхніка, 1980. — 680 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ